# Бернардзінскі касцёл і кляштар

*Калнін, В.В. Бернардзінскі касцёл і кляштар / В.В. Калнін // Калнін, В.В. Гродна ў дыялогу стагоддзяў: альбом / В.В. Калнін. - Мінск: Кавалер, 2008. - С. 87-93.*

Зусім іншае ўражанне пакідае архітэктура бернардзінскага касцёла, не менш грандыёзнага, чым фарны. На панараме Гродна з левага берага Нёмана касцёл нагадвае карабель з высокай мачтай-званіцай, які, здаецца, плыве над горадам. Пры бліжэйшым аглядзе ўражвае кампазіцыйная дасканаласць спалучэння асобных частак - касцёла, званіцы, кляштарнага корпуса.

Агляд касцёла варта пачынаць ад усходняй апсіднай часткі. Высокія стрэлападобныя нішы з вокнамі, кантрафорсы па вуглах - гэта элементы гатычнага стылю. Пачатак будаўніцтва вядомы - 1602 год. На нашых землях ужо ўзводзілі храмы рэнесанснага і нават барочнага стыляў. Аднак ордэн бернардзінцаў быў болып кансерватыўны, таму і ў архітэктуры прытрымліваўся даўніх традыцый, але не доўга. Ужо бакавыя і галоўны фасады маюць чыстыя, спакойныя формы. Таксама ў стылі, бліжэйшым да рэнесансу, чым да барока, вырашана архітэктура кляштарнага корпуса. І толькі вежа-званіца, асабліва яе верхняя частка, мае выразныя рысы барока.



Разам з тым ніякай мешаніны стыляў пры ўспрыманні цалкам усяго касцёльна-кляштарнага комплексу не адчуваецца. Наадварот, помнік архітэктуры ўспрымаецца як непарушна суцэльны арганізм. Дасягнута гэта яго творцамі дзякуючы тонкаму адчуванню нюансаў. Напрыклад, скульптурная дынамічнасць званіцы разгортваецца вышэй франтона галоўнага фасада. Дзеля кампазіцыйнай раўнавагі далучанаму да званіцы падоўжанаму фасаду кляштара таксама нададзена дынамічная экспрэсія: шэраг моцна высунутых пілястраў, спалучаных лёгкімі лучковымі перамычкамі, пры сонечным надвор'і стварае складаную святлоценявую артыкуляцыю. Нарэшце, бабінец (уваходны павільён) з далікатным паўкруглым франтонам далучаны да галоўнага фасада касцёла не ўпрост па восі, а з нязначным адхіленнем у бок званіцы, што надае ансамблю яшчэ большую гарманічнасць і сабранасць.



Інтэр'ер касцёла па багацці аздаблення мала саступае фарнаму, аднак тут адсутнічаюць драматызм і напружанасць апошняга. Гэтаму спрыяе моцная, але стрыманая тэктоніка ўнутранай прасторы. Тут таксама можна адзначыць сляды гатычнага ці нават раманскага стылю: лёгкая завостранасць напружаных арак, якія аддзяляюць галоўны нэф ад прэсбітэрыя і бакавых нэфаў; спрошчаная рытміка арачнага пояса бакавых хароў; падзел скляпенняў на нескладаныя палі з выступаючымі гуртамі без аздобаў. Пілястры ордэра амаль зліваюцца з плоскасцю слупоў і сцен, ствараючы празрыстую, светлую прастору галоўнага нэфа.

Галоўны і бакавыя алтары барочныя, болыш познія, ужо 18-га стагоддзя, толькі і тут барока стрыманае. Ёсць развароты калонаў, але

няма выкрутасаў, карнізы не чапляюцца за паветра, а ляпная пабеленая скульптура, хоць і вылучаецца на цьмяным фоне алтароў, аднак выглядае лёгкай, без напружанасці і падобная больш на камячкі ваты, якія павольна разляцеліся па розныя бакі.

Адзіны прыклад кампазіцыйнай звязанасці скульптурных групаў маецца ў Латэранскай капліцы. У кампазіцыі пераважае дэкаратыўны матыў хоць і фантастычнага, але расліннага характару, постаці святых і анёлаў свабодна размясціліся нібы ў цудоўным садзе. Простыя абрысы твараў і фігур, нязмушанасць рухаў нагадваюць пра пастаральны матыў, модны ў пазнейшыя часы.

З іншых элементаў інтэр’ера вартыя ўвагі дывановы дэкор жалезных кратаў пры ўваходзе і размалёваныя дзверы, што вядуць з бакавога нэфа ў сам кляштар. На апошніх ёсць цікавы парсунны жывапіс, накладны замок і фігурныя завесы.

У бібліятэцы Вільнюскага універсітэта захоўваюцца пажоўклыя аркушы навучэнцаў 18-га стагоддзя з размалёўкамі сада перад бернардзінскім кляштарам у Гродне. Ёсць там лісты і па іншых архітэктурных практыкаваннях - ансамбль гродзенскага кляштара ўжо ў тыя даўнія часы лічыўся прыкладам высокага мастацтва.